*Л. І. Масейчук*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*L. Maseichuk*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 378.145+94(476) «1930/1940»**

# ВЫКЛАДАННЕ САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫХ ПРАДМЕТАЎ У БЕЛАРУСКІМ МЕДЫЦЫНСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ (1930–1940): РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПА МАТЭРЫЯЛАХ АРХІЎНЫХ ФОНДАЎ

# TEACHING SOCIO-HUMANITARIAN SUBJECTS AT THE BELARUSIAN MEDICAL UNIVERSITY (1930–1940 S): RECONSTRUCTION BASED ON THE MATERIALS OF ARCHIVAL FOUNDATIONS

*На падставе аналізу архіўных крыніц прыводзяцца прыклады адукацыйных праграм па такіх дысцыплінах, як гістарычны і дыялектычны матэрыялізм, гісторыя РКП(б). Вылучаецца колькасць аўдыторных гадзін, якія адводзіліся на кожную дысцыпліну. Вызначаецца форма выніковага кантролю, які прымяняўся на кожным з вышэйпералічаных прадметаў. Разглядаецца прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры марксізму-ленінізму.*

*Ключавыя словы: універсітэцкая адукацыя; гісторыя педагогікі; універсітэт; навучальныя планы; гуманітарныя дысцыпліны.*

*Based on the analysis of archival sources, examples of educational programs in such disciplines as historical and dialectical materialism, the history of the RCP (b) are given. The number of classroom hours allocated to each discipline is highlighted. The form of the final control which was applied on each of the above-stated subjects is defined. The teaching staff of the Department of Marxism-Leninism is considered.*

*Keywords: university education; history of pedagogy; university; curricula; humanities.*

У савецкі перыяд у вышэйшай школе вялікае значэнне надавалася ідэйна-палітычнаму выхаванню студэнтаў, адказнасць за якое ўскладалася на выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін. Цыкл гэтых дысцыплін складаўся з некалькіх канцэптуальна звязаных прадметаў і складаў метадалагічную аснову для ўсіх спецыяльнасцей вышэйшай школы Беларусі.

У дадзеным артыкуле станаўленне вучэбнай праграмы па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах разглядаецца на прыкладзе Беларускага дзяржаўнага медыцынскага інстытута (далей – БДМІ), які быў створаны ў 1930–1931 гг. пры рэарганізацыі медыцынскага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (далей – БДУ).

Пры падрыхтоўцы артыкула былі выкарастаны дакументы фондаў 205 «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт» і 218 «Беларускі дзяржаўны медыцынскі

ўніверсітэт Наркамздрава БССР» Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Яшчэ ў 1925 г. да ліку абавязковых прадметаў, якія мусілі вывучаць студэнты ўсіх вышэйшых навучальных устаноў, дадалі дысцыпліну «асновы марксізму-ленінізму» – аб'яднанне дыялектычнага матэрыялізму і гісторыі камуністычнай партыі ў адным курсе. Таму пры вылучэнні у 1930–1931 гг. медыцынскага факультэта БДУ ў асобную вышэйшую установу – Беларускі дзяржаўны медыцынскі інстытут – выкладанне сацыяльна-гуманітарных дысцыплін было замацавана за агульнаўніверсітэцкай кафедрай марксізму-ленінізму. Яе выкладчыкі працавалі са студэнтамі I, II і III курсаў, якія атрымлівалі адукацыю на дзённым і вячэрнім аддзяленнях лячэбна-прафілактычнага, санітарна-прафілактычнага факультэтаў, а таксама факультэта мацярынства, маленства і дзяцінства [1, арк. 8, 9].

На кафедры выкладаліся такія дысцыпліны, як «дыялектычны матэрыялізм», «дыялектыка прыроды», «ленінізм». На іх засваенне вылучалася 105 навучальных гадзін [2, арк. 31]. З 1934/1935 навучальнага года, акрамя вышэйпералічанных дысцыплін, да сацыяльна-гуманітарнага блока быў далучаны «гістарычны матэрыялізм», які чытаўся на I і II курсах, і «палітэканомія». На іх засваенне адводзілася 45 гадзін і 130 гадзін адпаведна [3, арк. 1, 11, 16]. Формай кантролю па ўсіх вышэйпералічаных прадметах з'яўляўся залік [3, арк. 2, 12, 17].

На вячэрнім аддзяленні навучальныя планы па выкладанні сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, у параўнанні з дзённым, крыху адрозніваліся. Так, «дыялектычны» і «гістарычны матэрыялізм» чыталіся на I курсе вячэрняга аддзялення лячэбна-прафілактычнага факультэта і факультэта мацярынства, маленства і дзяцінства [3, арк. 5, 11, 16]. На засваенне курса вылучалася 80 гадзін [3, арк. 5, 21]. На II курсе студэнты працягвалі вывучэнне «дыялектычнага матэрыялізму» адначасова з «дыялектыкай прыроды» і «ленінізмам». На дысцыпліны адводзілася 40 і 50 навучальных гадзін адпаведна [3, арк. 6, 22].

На лекцыях і семінарах па дысцыпліне «ленінізм» вывучаліся паняцці пралетарская рэвалюцыя і дыктатура пралетарыяту; разглядаліся сялянскае і нацыянальнае пытанні, а таксама роля партыі ў грамадскіх працэсах [4, арк. 82–82 зв.].

Згодна з вучэбнымі планамі, курс па «дыялектычным матэрыялізме» вывучаўся як філасофскі. Таму ў вучэбнай праграме рабіўся акцэнт на раскрыцці такіх момантаў, як прадмет і задачы філасофіі, разглядалася яе гісторыя і ўзаемадзеянне з іншымі навукамі.

На занятках па «гістарычным матэрыялізме» студэнты павінны былі разгледзець такія паняцці, як вытворчыя сілы, базіс і надбудова; вывучыць працэс фарміравання класаў і класавай барацьбы; прааналізаваць тэорыі ўзнікнення дзяржавы і ролю пралетарыяту [4, арк. 82–82 зв.].

Пры вывучэнні дысцыпліны «дыялектычны і гістарычны матэрыялізм» у якасці асноўнай вучэбнай літаратуры пачынаючы з 1938 г. выкарыстоўвалася праца І. В. Сталіна «Пра дыялектычны і гістарычны матэрыялізм» (1938).

Для разумення прымянення метадаў дыялектычнага матэрыялізму ў прыродазнаўчых навуках і антрапалогіі студэнты былі абавязаны вывучыць раздзелы з кнігі Ф. Энгельса «Дыялектыка прыроды» – «Дыялектыка», «Асноўныя формы руху» і «Роля працы ў працэсе ператварэння малпы ў чалавека». Пры засваенні «марксізму» як навуковай дысцыпліны навучэнцы павінны былі азнаёміцца з артыкулам У. І. Леніна «Тры крыніцы і тры складовыя часткі марксізму» (1913).

У якасці дадатковай навучальнай літаратуры шырока рэкамендаваліся працы У. І. Леніна «З чаго пачаць?» (1901), «Што рабіць?» (1902), «Дзяржава і рэвалюцыя» (1918) і І. В. Сталіна «Пытанні ленінізму» (1924), «Аб Кастрычніцкай рэвалюцыі» (1932).

Напрыканцы 1930-х гг. дыялектычны матэрыялізм, які складаў філасофскую аснову марксізму, быў прызнаны афіцыйнай камуністычнай ідэалогіяй, што знайшло сваё адлюстраванне ў шэрагу пастаноў ЦК ВКП(б) адносна вышэйшай школы.

Згодна з пастановай «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам "Кароткага курса гісторыі ВКП(б)"» ад 14 лістапада 1938 г., замест шэрагу прадметаў («ленінізм», «гісторыя ВКП(б)», «дыялектычны матэрыялізм», «гістарычны матэрыялізм») уводзіўся адзіны курс «асновы марксізму-ленінізму» [5, с. 51], вывучэнне якога пачыналася з «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» з адначасовым вывучэннем першакрыніц марксізму-ленінізму. Менавіта ад гэтага часу і пачалася перабудова выкладання грамадскіх дысцыплін у БДМІ.

Новыя навучальныя планы былі зацверджаны Усесаюзным камітэтам па вышэйшай школе ў 1938 г. Згодна з планамі на грамадскія навукі адводзілася 590 гадзін на год (у навучальных планах, якія дзейнічалі з 1935 па 1938 гг., – 272 гадзіны).

Загадам ад 11 студзеня 1939 г. «Аб пастаноўцы выкладання марксізму-ленінізму ў вышэйшай школе» ў БДМІ ўводзілася абавязковае вывучэнне курса гісторыі ВКП(б), палітычнай эканоміі, філасофіі.

Паміж іншым у загадзе падкрэслівалася, што «савецкая вышэйшая школа, якая з'яўляецца кузняй высокакваліфікаваных савецкіх спецыялістаў для ўсіх галін народнай гаспадаркі і культуры, атрымала з выхадам у свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» і апублікаваннем пастановы ЦК ВКП(б) вялікую тэарэтычную і палітычную зброю, пры дапамозе якой яна паспяхова вырашыць задачу марксісцка-ленінскага выхавання савецкага студэнцтва, задачу падрыхтоўкі кадраў, цалкам адданых вялікай справе партыі Леніна – Сталіна» [15].

Навучальныя праграмы па «Гісторыі РКП(б)» ніколі не карэктаваліся на месцах і ў іх дакладна прапісваліся ўсе кірункі, якія выкладчык павінен быў «данесці» да студэнтаў [5, с. 51]. Асноўным падручнікам па гісторыі ВКП(б), якую вывучалі студэнты БДМІ, з 1938 г. становіцца праца І. В. Сталіна «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» (1938).

Разам з вышэйпералічанымі сацыяльна-гуманітарнымі дысцыплінамі студэнты вывучалі такі прадмет, як «палітэканомія». Так, у рамках курса палітэканоміі студэнты павінны былі ведаць, што такое кошт і як ён фарміруецца; што такое тавар і таварны фетышызм. Падрабязна разглядалася прызначэнне капіталу, фарміраванне дадатковага кошту і інш. [6, арк. 30].

Як адзначалася раней, дыялектычны матэрыялізм, які складаў філасофскую аснову марксізму, быў прызнаны афіцыйнай камуністычнай ідэалогіяй, у сувязі з чым да падбору выкладчыкаў, што чыталі дадзеную дысцыпліну, падыходзілі вельмі адказна. Яны павінны былі не толькі добра ведаць свой прадмет, але і ў абавязковым парадку з'яўляцца членамі ВКП(б), мець «пралетарскае паходжанне», вышэйшую адукацыю і не мець судзімасцей. Нацыянальнасць значэння не мела.

У першы 1930/1931 навучальны год дзейнасці інстытута на кафедры марксізму-ленінізму працавалі два штатныя выкладчыкі. З-за вострага недахопу кваліфікаваных кадраў практыкавалася знешняе сумяшчальніцтва і запрашэнне спецыялістаў на ўмовах пагадзіннай аплаты працы.

У 1934/1935 навучальным годзе колькасць штатных выкладчыкаў складала пяць чалавек [7, арк. 1, 6, 7]. У 1935 г. на кафедры марксізму-ленінізму працавалі: в. а. загадчыка кафедры, дацэнт С. Я. Тапаз[1], асістэнты А. А. Варановіч, І. А. Улазаў, выкладчык Г. А. Фрыдрых і прафесар І. З. Сурта [7, арк. 8].

У 1938/1939 навучальным годзе штат кафедры быў пашыраны. 12 лістапада 1940 г. на кафедры працавала 14 выкладчыкаў: в. а. загадчыка кафедры М. С. Дрыгілёў, дацэнты П. Х. Рубінчык, С. Я. Тапаз, І. І. Саладкоў; старшы выкладчык Х. М. Прусіна, выкладчыкі А. Ф. Верамейчык, Б. М. Каробачка, Д. В. Горбах, Н. С. Мееравіч, У. Р. Лобань, О. Ш. Гінзбург, Г. А. Эрынбург, М. М. Валошынаў і асістэнт кафедры Х. І. Варгаўцік [8, арк. 14].

Вялікая Айчынная вайна, якая распачалася 22 чэрвеня 1941 г., прыпыніла працу медінстытута больш чым на два гады. Толькі 1 кастрычніка 1943 г. у г. Яраслаўлі БДМІ аднавіў сваю дзейнасць.

У 1943/1944 навучальным годзе інстытут складаўся з аднаго лячэбнага факультэта, на які было залічана 769 студэнтаў [9, арк. 7]. Сярод

---

[1]З 1934 г. абавязкі загадчыка кафедры марксізму-ленінізму выконваў Саламон Яхімавіч Тапаз, які сумяшчаў дадзеную пасаду з кіраваннем гістарычнай кафедрай у Беларускім політэхнічным інстытуце.

36 універсітэцкіх кафедр, што распачалі працу, была і кафедра марксізму-ленінізму [9, арк. 11], менавіта яе выкладчыкі адказвалі не толькі за сацыяльна-гуманітарную адукацыю будучых медыкаў, але і за іх ідэалагічную падрыхтоўку. Як сведчаць архіўныя дакументы, вялікае значэнне надавался такой дысцыпліне, як «Гісторыя РКП(б)» [9, арк. 7, 16].

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (28 ліпеня 1944 г.) інстытут вярнуўся з эвакуацыі ў г. Мінск. 1944/1945 навучальны год выдаўся складаным. Адчуваўся востры дэфіцыт кваліфікаваных кадраў [10, арк. 1]. Шэраг выкладчыкаў не вярнуліся з эвакуацыі ў Беларусь, бо прынялі прапановы па працаўладкаванні ад вышэйшых навучальных устаноў, размешчаных у рэгіёнах, менш пацярпелых ад ваенных дзеянняў.

Вясной 1945 г. штат кафедры зменшыўся ў параўнанні з даваенным у два разы і налічваў сем ставак [11, арк. 1а]. Аднак да канца 1944/1945 навучальнага года нават яны не былі цалкам укамплектаваны. Не вялася «з прычыны адсутнасці кафедры як творчай адзінкі» [12, арк. 13] у 1945 г. і навуковая работа, пра што паведамляў на пасяджэнні Савета інстытута загадчык кафедры марксізму-ленінізму І. М. Пяроўскі 23 студзеня 1946 г.

На пачатак 1946 г. на кафедры працавалі: загадчык кафедры дацэнт І. М. Пяроўскі, выкладчыкі Э. Я. Давыдава, Д. Г. Шаткіна, М. І. Едзідовіч, А. С. Фрумкіна, С. Г. Рудніцкі, А. Ф. Верамейчык [11, арк. 1а-2].

У 1946/1947 навучальным годзе на кафедры функцыянавалі тры студэнцкія гурткі: філасофскі – па дыялектычным і гістарычным матэрыялізме, гістарычны – па вывучэнні знешняй палітыкі СССР і гурток па вывучэнні кнігі таварыша І. В. Сталіна «Аб Вялікай Айчыннай вайне Савецкага Саюза» (1942).

Усяго ў гуртках займалася 48 чалавек. Найбольшую цікавасць у студэнтаў выклікалі філасофскі і гістарычны гурткі.

У красавіку 1947 г. быў выдадзены загад Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР, у якім выкрываліся недахопы ў ідэалагічнай працы, адзначаўся нізкі тэарэтычны ўзровень выкладчыкаў, крытыкавалася сухасць выкладання без дастатковых доказаў. Асабліва рабіўся акцэнт на тое, што выкладчыкі недастаткова тлумачаць студэнтам «карэнную супрацьлегласць пралетарскага і буржуазнага светапогляду, не прыцягваюць найбагацейшы фактычны матэрыял з жыцця і дзейнасці бальшавіцкай партыі і савецкай дзяржавы, недастаткова тлумачаць перавагі сацыялістычнага грамадскага ладу над капіталістычным» [13]. З улікам усяго вышэй пералічаннага ў мэтах паляпшэння якасці выкладання грамадскіх навук было прынята рашэнне ўключыць з 1947/1948 навучальнага года курс «Асновы марксізму-ленінізму» ў спіс прадметаў, якія выносяцца на дзяржаўныя іспыты, прачытаць шэраг лекцый, прысвечаных біяграфіям У. І. Леніна і І. В. Сталіна, а таксама ўмацаваць кафедры грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў Беларусі кваліфікаванымі кадрамі [13].

Пераўтварэнні пайшлі на карысць. Згодна са справаздачай кафедры марксізму-ленінізму экзаменацыйная сесія ў 1946/1947 навучальным годзе паказала, што студэнты медінстытута цалкам здавальняюча засвоілі веды па прадмеце «асновы марксізму-ленінізму» [14, арк. 5, 8; 15, арк. 12].

Такім чынам, у медыцынскім інстытуце вывучаліся такія дысцыпліны, як гістарычны і дыялектычны матэрыялізм, гісторыя РКП(б) і асновы марксізму-ленінізму, палітэканомія. Засваенне гэтых дысцыплін павінна было дапамагчы студэнтам раскрыць свой навуковы патэнцыял і навучыць іх рацыянальнаму мысленню.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. НАРБ. – Ф. 218. Воп. 1. Спр. 464.
2. НАРБ. – Ф. 218. Воп. 1. Спр. 108.
3. НАРБ. – Ф. 218. Воп. 1. Спр. 618.
4. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1058.
5. *Мосейчук, Л. И.* Специфика преподавания гуманитарных дисциплин на медицинском факультете Белорусского государственного университета в 1920-е гг. / Л. И. Мосейчук // Труды Белорус. гос. технолог. ун-та. – 2020. – № 2(239). – С. 50–53. – (Сер. VI. История, философия).
6. НАРБ. – Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1098.
7. НАРБ. – Ф. 218. Воп. 1. Спр. 623.
8. НАРБ. – Ф. 218. Воп. 1. Спр. 635 в.
9. НАРБ. – Ф. 218. Воп. 1. Спр. 3.
10. НАРБ. – Ф. 218. Воп. 1. Спр. 6.
11. НАРБ. – Ф. 218. Воп. 1. Спр. 4.
12. НАРБ. – Ф. 218. Воп. 1. Спр. 9.
13. Библиотека нормативно-правовых актов Союза Советских Социалистических Республик [Электронный ресурс]. – URL: http://www.libussr.ru/doc_ussr/ussr_4080.htm. – Дата доступа: 13.11.2019.
14. НАРБ. Ф. 218. Воп. 3. Спр. 25.
15. НАРБ. Ф. 218. Воп. 3. Спр. 56.
16. Приказ от 11 января 1939 г. «О преподавании марксизма-ленинизма в высшей школе [Электронный ресурс] // Музей истории российских реформ им. П. А. Столыпина. – URL: http://xn--e1aaejmenocxq.xn--p1ai/node/13995. – Дата доступа: 21.12.2021.


**(Дата падачы: 22.02.2022 г.)**